Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 11 (702) ● Пятніца 22 сакавіка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ

Актавая зала, прэзідыум і больш сотні выпускнікоў хімічнага факультэта. І нейкая хвалюючая цішыня, якая парушаецца голасам старшыні ўрачыстага сходу, дзе ўручаюць былым студэнтам, а цяпер ужо спецыялістам-хімікам, тоненькую кніжачку — дыплом.

Так, гэта ўсё будзе, калі ўлягуцца хваляванні пасля абароны дыпломных работ, пасля дзяржаўных экзаменаў. Але пакуль яшчэ да гэтага далёка. Цяпер — настойлівая праца. Колбы, мензуркі, хімічныя рэактывы і дыпломнікі ў белых халатах — усё гэта я ўбачыла ў хімічнай лабараторыі універсітэта.

Пяцікурснікі перад гэтым размеркаваліся. Да жаданага фінішу рыхтаваліся даўно, імкнуліся да яго. Але, чаго граха таіць, баяліся, страшна хваляваліся, калі адчынялі дзверы ў пакой, дзе засядала камісія па размеркаванню маладых спецыялістаў.

На пятым курсе 112 студэнтаў, значыць — столькі ж і дарог. Адны прывядуць хімікаў у школы, і 50 былых студэнтаў зоймуць месца за настаўніцкімі сталамі. 12 выпускнікоў застануцца на розных кафедрах факультэта.

Вельмі задаволена сваім накіраваннем Святлана Ракава. Яна будзе працаваць у Гродна, на азотна-тукавым камбінаце. Гаворыць, што яе мара збылася. У школе захаплялася хіміяй, думала паступіць у медінстытут. Але цяга да хіміі аказалася мацнейшай. Яна ж і прывяла яе ў сцены універсітэта. Цяпер С. Ракава марыць аб цікавай працы ў лабараторыі.

Для Давыда Шойхіда хімія — сапраўднае прызванне. Ён можа гадзінамі чараваць над прыборамі, колбамі, да паўночы праседжваць у лабараторыі. А задачы, дык тыя проста не даюць яму спакою. Знайшоўшы тоненькую нітачку, ён настойліва ішоў за ёю. І дакапваўся да глыбіні. Складанейшая задача рашана, а за ёй яшчэ адна, дзве, тры... А раніцой прыемна прыйсці ў аўдыторыю і з такой лёгкасцю адказаць на пытанне аднакурсніка. Здаецца, і не было напружаных гадзін пошуку. На працягу ўсёй вучобы ва універсітэце Давід займаўся ў студэнцкім навуковым таварыстве, захапляўся неарганічнай хіміяй. Шойхід паедзе ў Барысаўскі раён, у школу. Мне здаецца, што сваю любоў да хіміі ён перадасць вучням.

Таня Кавалёва чатыры гады займалася навуковай працай. Некаторыя яе работы былі апублікаваны. Захаплялася палімерамі. Працоўны шлях ёй давядзецца пачаць на Лукомльскай ГРЭС.

Генадзь Кажушкоў, Таццяна Луцкіна будуць сярод тых дванаццаці, хто застанецца ў сценах роднага універсітэта.

Мікалай Вараб'ёў будзе выкладаць у Бабруйскім хімічным тэхнікуме, а Ларыса Сяўрук паедзе на Гомельшчыну.

Многіх выпускнікоў чакаюць хімічныя прадпрыемствы Магілёва, Ліды, Мінска.

Вельмі ўдзячны выпускнікі свайму дэкану Ф. М. Капуцкаму. Ён зрабіў вельмі многае па падрыхтоўцы размеркавання. Сустракаўся з некаторымі прадстаўнікамі прадпрыемстваў, дзе будуць працаваць выхаванцы факультэта, з дырэктарамі школ, дзе пачнецца выкладчыцкая дзейнасць выпускнікоў.

Праўда, студэнты адзначылі, што пры размеркаванні не заўсёды ўлічвалася спецыялізацыя, таму і атрымалася, што людзі, якія, напрыклад, раней займаліся аналітыкай, павінны перакваліфікавацца...

Размеркаванне закончана, але выпускнікі пакуль што яшчэ студэнты. Іх вы сустрэнеце ў аўдыторыях, лабараторыях. Яны працуюць як ніколі, напорыста і старанна. Хутка абарона!

А. АПЕЛЬ, студэнтка II курса журфака.





*На хімфаку адбылося размеркаванне студэнтаў-выпускнікоў на працу. Большасць з іх накіравана ў раённыя цэнтры рэспублікі.*

*НА ЗДЫМКАХ: студэнт V курса Сяргей Дзямідаў у час субяседавання; унізе — дзяўчаты хімфака перад размеркаваннем.*

## ЧАКАЮЦЬ МАЛАДЫХ

**Яшчэ дзесяткамі моцных нітак звязацца універсітэт з рознымі куткамі роднай Беларусі. На гэтым тыдні заканчваецца размеркаванне выпускнікоў. Услед за хімікамі перад камісіяй паўсталі гісторыкі.**

**У гэтым годзе, расказвае дэкан факультэта Пётр Захаравіч Савачкін, — мы выпускаем 80 чалавек. Большасць з іх мае добрую падрыхтоўку, выдатна зарэкамендавала сябе на педагагічнай практыцы. Актывісты, удзельнікі навуковага жыцця універсітэта, спартсмены, яны, мы спадзяёмся, і на самастойнай працы пакажуць сябе з самага лепшага боку.**

**Многіх выпускнікоў з радасцю прымуць школы рэспублікі. У распараджэнне Чэрвенскага раённага аддзела народнай асветы напраўлена Галіна Шаўчэнка, Салігорскага — Георгій Пашкоўскі Гродзенскага аблано — Анатоль Бязмен, Валянціна Вяргей паедзе ў Гомельскую вобласць.**

**Групу выпускнікоў, сярод якіх М. Бельскі, М. Паўлаў, К. Дзябёлаў, У. Лескавец і іншыя, чакаюць прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы. У аспірантуру і асістэнтамі на кафедры грамадскіх навук рэкамендаваны С. Сальнікаў, В. Клімовіч, Ф. Мельнік, Е. Калеснік, В. Сініца.**

**Маладых спецыялістаў чакаюць усюды! Мы жадаем выпускнікам паспяховага заканчэння вучобы і шчаслівай дарогі ў самастойнае жыццё.**

**А. ЦІХАНОВІЧ.**

Да 50-годдзя ленінскага камсамола



## СУМЕСНЫМІ СІЛАМІ

У нашым універсітэце з кожным годам паляпшаецца выхаванне моладзі. Гэтаму ў значнай ступені спрыяе сумесная праца дэканатаў, кафедраў, рэктарата, партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, самадзейных студэнцкіх калектываў. І ўсё ж, як адзначалася на снежаньскім Пленуме ЦК ВЛКСМ, камсамольскія арганізацыі яшчэ не выкарыстоўваюць усіх магчымасцей, каб студэнцтва творча вывучала марксісцка-ленінскую тэорыю, заўсёды спалучала глыбокі аналіз грамадскіх з'яў з актыўным удзелам у вырашэнні канкрэтных задач камуністычнага будаўніцтва. У нас таксама ёсць прыклады, калі асобныя камсамольскія арганізацыі вядуць палітыка-выхаваўчую работу адасоблена ад дзейнасці кафедр, іх мерапрыемствы не замацоўваюць, не працягваюць таго, што пачалі выкладчыкі на лекцыях і семінарах.

Дзеля справядлівасці нельга не адзначыць, што інтарэс студэнтаў да грамадскіх навук значна ўзрос. У мінулую сесію, напрыклад, пераважная большасць студэнтаў атрымала па гэтых дысцыплінах выдатныя і добрыя адзнакі. Нядаўна глыбокія веды паказалі выпускнікі гістфака, якія здавалі спецкурсы па гісторыі КПСС і гісторыі Беларусі, а на экзамене па гісторыі філасофіі яны атрымалі 21 «выдатна», 46 «добра» і толькі тры «здавальняюча». Дарэчы, па выніках зімовай сесіі гістфак выйшаў на першае месца ва універсітэце. Мінулы ж год гэты факультэт перажыў шмат цяжкасцей, атрымаў нямала папрокаў за нізкую паспяховасць. Дэканат і партбюро, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі зрабілі адпаведныя вывады з крытыкі і змаглі арганізаваць паўсядзённую работу на ўсіх курсах. Цікавей пачала будаваць сваю працу і камсамольская арганізацыя. Нядаўна, заслухаўшы яе справаздачу, камуністы высока ацанілі многія яе мерапрыемствы выхаваўчага характару.

З году ў год дасканалыя веды атрымліваюць у галіне грамадскіх навук студэнты фізічнага факультэта. Безумоўна, у фізікаў ды і ў студэнтаў іншых прыродазнаўчых факультэтаў ёсць пункты сутыкнення грамадскіх і спецыяльных навук пры іх вывучэнні. Але ўменне выкарыстоўваць веды, скажам, па фізіцы для вытлумачэння філасофскіх палажэнняў і складаных з'яў рэчаіснасці прыходзіць да кожнага не самацёкам. Патрэбна вялікая выхаваўчая работа, і тут важную ролю адыгрывае індывідуальны падыход. Аб вопыце арганізацыі гэтай работы камуністамі і камсамольцамі ў мінулым нумары нашай газеты падрабязна расказаў сакратар партбюро фізфака П. Салаў.

Лекцыі па філасофіі, гавораць студэнты-фізікі, — гэта для нас падзея. Мы ідзем на іх заўсёды з вялікай ахвотай... З удзячнасцю адносяцца яны да свайго выкладчыка дацэнта Анатоля Уладзіміравіча Самускевіча. А. У. Самускевіч сам добра ведае фізіку, многа выкарыстоўвае цікавага фактычнага матэрыялу, як у спецыяльных дысцыплінах так і ў праблемах дыялектычнага матэрыялізму.

Можна расказаць многа цікавага аб новым у рабоце кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Тут сталі шырока выкарыстоўвацца тэхнічныя сродкі навучання, наглядныя дапаможнікі, лекцыі-экскурсіі на прадпрыемствы, лекцыі-сустрэчы з удзельнікамі знамянальных падзей. І ў гэтым супрацоўнікам кафедры ўсё большую дапамогу пачынаюць аказваць камсамольскія арганізацыі.

Камітэт камсамола універсітэта імкнецца наладжваць такія ідэйна-палітычныя мерапрыемствы, якія развіваюць у студэнтаў вострае пачуццё сучаснасці, адпавядаюць інтарэсам выбранай прафесіі. Аб гэтым сведчыць дзейнасць разнастайных дыскусійных клубаў, лекторыяў, правядзенне тэарэтычных канферэнцый. Пры гэтым мы заўсёды трымаем на ўвазе падрыхтоўку арганізатараў спраў. Праўда, тут не ўсё ідзе гладка, і многае залежыць не ад нас.

Вось прыклад. Чатыры гады будучы спецыяліст фарміруецца на тэарэтычнай базе, і толькі год-паўтара адводзіцца на вучэбную практыку. Рэктарат, партком і камітэт камсамола атрымліваюць шмат пісьмаў, у якіх выпускнікі скардзяцца, што вельмі часта яны адчуваюць цяжкасці пры вырашэнні практычных пытанняў, наогул, у арганізацыйнай рабоце. На нашу думку, наспела неабходнасць прывесці ў належныя суадносіны практычнае і тэарэтычнае засваенне сакрэтаў прафесіі, такія суадносіны, якія адпавядаюць запатрабаванням сучаснасці. Камітэт камсамола падтрымлівае прапанову акадэміка А. Аляксандрава («Известия» ад 19 сакавіка г. г.) аб уключэнні ў праграмы па філасофіі больш пытанняў па эстэтыцы, этыцы і праблемах асобы, а таксама аб далейшым удасканаленні выкладання іншых грамадскіх навук.

У сваю чаргу, мы будзем развіваць ужо вызначаныя ў нашым універсітэце дзве лініі па набыццю студэнтамі арганізатарскіх навыкаў. Па-першае, пашырым магчымасці для набыцця гэтых навыкаў праз актыўны ўдзел кожнага студэнта ў грамадска-палітычнай рабоце на факультэце, па-другое, узмацнім дзейнасць камсамольцаў за сценамі нашага універсітэта. Тут у нас ужо накоплен станоўчы вопыт.

Вопыт ёсць і па іншых пытаннях камсамольскай работы. На адных факультэтах ён больш багаты, на другіх больш бедны. Вось чаму камітэт камсамола універсітэта падтрымлівае пажаданне сакратара камітэта камсамола гістфака Т. Глушаковай аб тым, каб на старонках шматтыражкі камсамольскія актывісты падзяліліся вопытам сваёй работы ў вырашэнні надзённых праблем свайго жыцця. Гэта тым больш важна, што мы ідзем да двух знамянальных дат — 50-годдзя Савецкай Беларусі і 50-годдзя камсамола. Сустрэць іх дастойна, з новымі поспехамі ў палітыка-выхаваўчай і арганізацыйнай працы— першасны абавязак універсітэцкай камсамоліі.

М. ЦІВА,
сакратар камітэта камсамола універсітэта.

## НОВЫ ДЗЕНЬ

**Пад такой назвай мы адзначаем свой новы год у Афганістане. Гэты дзень выпадае на 21 сакавіка. Мы сустракаем 1347 год. На першы погляд гэта здаецца дзіўным: розпасць паміж лічбамі 1968 і 1347 складае 621 год. Вось у гэтым 621 годзе прарок іслама Мухамед прыйшоў з Мекні ў Медыну. З таго часу, калі мусульманская рэлігія была прынята ў нашай краіне, мы пачалі лічыць гады.**

**Чаму мы адзначаем першы дзень іменна 21 сакавіка? Таму што гэты дзень у нас — першы дзень вясны. З яго надыходам пачынаюцца палявыя работы. Адзначаецца ён яшчэ і як дзень селяніна, 78 працэнтаў насельніцтва нашай краіны займаецца сельскай гаспадаркай, і дзень 21 сакавіка — кур'ер, які прыносіць вестку сялянам аб пачатку работ.**

**Новы дзень сустракаецца радасна і ўрачыста. Людзі, сабраўшыся ў адным месцы, з ранку да вечара іграюць, танцуюць, спяваюць песні.**

АБДУЛ ГАФУР СУЛТАНІ,
студэнт І курса фізфака.

# ПЯЮ МАЮ РЭСПУБЛІКУ

Павольна разыходзіцца заслона на сцэне актавай залы і перад гледачамі, нібы з сярэднявякоўя, з'яўляецца вядомы купалаўскі гусляр:

Невыдумная світка —
убор на плячах,
Барада, як снег белы —
такая,
Незвычайны агонь
у задумных вачах,
На каленях ляглі
гуслі-баі...

Гэтай імправізацыяй, якую паказалі студэнты гістарычнага факультэта, пачаўся трэці дзень агляду самадзейных мастацкіх калектываў нашага універсітэта, прысвечанага 50-годдзю БССР.

Вось ужо другі год першае месца ў гэтых аглядах займае гістарычны факультэт. І на гэты раз ён прадставіў добрую і разнастайную праграму. Найбольш хвалюючым і запамінальным нумарам была «Песня гусляра» з паэмы Янкі Купалы «Курган» у выкананні Юрыя Шынкара.

Члены журы былі ўражаны як арыгінальным падыходам да пастаноўкі, так і яе таленавітым мастацкім выкананнем.

Добра выступілі салісты гістарычнага факультэта Фелікс Ліфшыц, Уладзімір Мамінаў, Анатоль Злобіч. Лёгкасцю, грацыяй і чароўнасцю вызначалася танцавальная пара — Люда Грышчанка і Уладзімір Дудко, якія выканалі «Мінскі вальс».

Студэнт П. Ротман з вялікай патэтыкай прачытаў урывак з уласнай паэмы «Балада аб амерыканскім салдаце».

Пры вызначэнні другога месца меркаванні журы раздзяліліся — адны прапаноўвалі юрыдычнаму факультэту, за больш дасканалае выкананне; другія — філфаку, за масавасць, за нацыянальны каларыт, за літаратурна-музычную кампазіцыю, якая па сваёй тэматыцы і выкананню поўнасцю адпавядала «Палажэнню», распрацаванаму журы пры аб'яўленні агляду.

Толькі тайнае галасаванне вызначыла, што абодва факультэты заслугоўваюць займаць другую ступеньку п'едэстала гонару.

Вялікія поспехі ў развіцці мастацкай самадзейнасці на геаграфічным факультэце — трэцяе месца. Значны ўклад у падрыхтоўку да агляду ўнесла дацэнт Надзея Паўлаўна Хрыпко.

Прыемным сюрпрызам агляду было тэматычнае выступленне «Уходят мальчики», прадстаўленае клубам «Праметэй» факультэта журналістыкі.

...Закончыўся агляд. Агульныя меркаванні па яго правядзенню выказалі члены журы. Яны адзначылі, што вельмі вырасла майстэрства многіх самадзейных артыстаў; як правіла, удзельнікі агульнауніверсітэцкай самадзейнасці не толькі самі прынялі непасрэдны ўдзел у аглядзе, але і з'яўляюцца арганізатарамі мастацкай самадзейнасці факультэтаў.

У ліку першых можна назваць Паўла Лыскаўца, Аляксея Дзегцярова, Юрыя Шынкара, Уладзіміра Дудко, Людмілу Грышчанка і многіх іншых. Большасць праграм былі тэматычнымі і адлюстроўвалі дасягненні беларускага народа за 50 гадоў.

Чым ты была і чым ты стала, Беларусь мая родная, — гэта думка ўвесь час прысутнічала на аглядзе.

**В. ЛІТВІНКА,**
**старшыня праўлення клуба.**




# ПАДРАХУНКІ І ПЛАНЫ

Юбілей Савецкай Беларусі вымагае ад нас, выкладчыкаў, яшчэ большай увагі да надзённых праблем выхавання маладога пакалення, да ўдасканалення самых розных форм і метадаў навучання.

Аднак выкладчык універсітэта — не толькі педагог, але і вучоны, глыбокі знаўца ў той ці іншай галіне ведаў. Таму, падрахоўваючы зробленае, хочацца глянуць перш за ўсё на навуковую працу супрацоўнікаў кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта. Няма таго года, каб не выйшла некалькі кніг супрацоўнікаў нашай кафедры — асобных манаграфій, крытычных нарысаў, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларускай літаратуры і фальклору для студэнтаў філалагічных факультэтаў пединстытутаў і універсітэта.

Дацэнт І. Я. Навуменка толькі ў мінулым годзе выдаў дзве навуковыя працы — даследаванне пра беларускіх пісьменнікаў-дэмакратаў і манаграфію пра Янку Купалу. Сёлета выходзіць з друку яго кніга пра творчасць Якуба Коласа. І. Я. Навуменка закончыў працу над доктарскай дысертацыяй «Канцэпцыя чалавека ў творчасці Я. Купалы і Я. Коласа». Шматлікія аматары беларускай літаратуры ведаюць Івана Навуменку і як пісьменніка, аўтара некалькіх зборнікаў апавяданняў і двух раманаў.

Дацэнт А. А. Лойка, побач з актыўнай паэтычнай і крытычнай дзейнасцю, займаецца плённай навуковай працай. Тры яго манаграфіі — «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура», «Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» і «Максім Багдановіч» — добра вядомы навуковай грамадскасці, і не толькі ў нашай рэспубліцы. Неўзабаве павінна ўбачыць свет яго кніга пра сучасную беларускую паэзію «Сустрэча з днём сённяшнім». Цяпер А. А. Лойка заканчвае доктарскую дысертацыю на тэму: «Максім Багдановіч і праблемы беларускай паэзіі пачатку XIX стагоддзя».

На ліку дацэнта С. Х. Аляксандровіча некалькі кніг. Сярод іх вылучаюцца «Старонкі братняй дружбы», дзе даследуюцца сувязі беларускай літаратуры з іншымі славянскімі, «Незабыўнымі сцежкамі» (два выданні), «Ад роднае зямлі» і «Па слядах паэтычнай легенды». У іх у жывой белетрыстычнай форме апавядаецца пра творчасць выдатных беларускіх пісьменнікаў.

Дацэнт Дз. Я. Бугаёў надрукаваў тры манаграфіі: «Шчодрае сэрца пісьменніка» (пра творчасць Міхася Лынькова), «Паэзія Максіма Танка» і «Уладзімір Дуброўка». Усім ім дадзена ў друку самая высокая ацэнка.

Дацэнт кафедры Н. С. Гілевіч вядомы многім чытачам перш за ўсё як цікавы паэт (ён выдаў больш дзесяці кніг паэзіі, пераклаў на беларускую мову многія вершы і апавяданні балгарскіх пісьменнікаў). Актыўна працуе ён і ў навуцы. У яго кнізе «Акрыленая рэвалюцыяй» упершыню ў нашым літаратуразнаўстве так глыбока вывучана паэзія «Маладняка».

Плённа працуюць і іншыя вучоныя. Так, дацэнт В. В. Казлова надрукавала шэраг артыкулаў пра мастацкае майстэрства Якуба Коласа і Міхася Лынькова. Яна напісала некалькі метадычных дапаможнікаў для студэнтаў-завочнікаў. Дацэнт М. Б. Яфімава выдала манаграфію пра творчасць Янкі Маўра, прыняла актыўны ўдзел у стварэнні падручнікаў па беларускай дзіцячай літаратуры.

Дацэнт К. Р. Хромчанка, аўтар кнігі пра творчасць Піліпа Пестрака, даследуе літаратуру народаў СССР, шмат аддае часу распрацоўцы шэрагу праблем беларускага літаратуразнаўства. В. а. дацэнта С. А. Гусак надрукаваў летась грунтоўную манаграфію пра Аляксея Кулакоўскага. Старшы выкладчык Л. А. Царанкоў працуе ў галіне методыкі выкладання літаратуры ў сярэдняй школе. Ён напісаў шэраг артыкулаў, склаў хрэстаматыю па беларускай літаратуры для 8-х класаў сярэдняй школы, выдаў кнігу па пытаннях методыкі. Выкладчык В. П. Рагойша паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, часта выступае ў друку з навукова-крытычнымі артыкуламі. Членамі кафедры складзена і выдадзена праграма па гісторыі беларускай літаратуры для філалагічных факультэтаў.

За апошнія гады выданы мае кнігі: «На шляхах да рэалізму» і «Па шляху рэалізму», у якіх даследуецца працэс станаўлення рэалізму ў беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя, разглядаюцца асаблівасці развіцця крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры і зараджэнне ў ёй элементаў рэалізму сацыялістычнага; «Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX стагоддзя» і «Славянская супольнасць», якія з'яўляюцца вынікам распрацоўкі пытанняў сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі славянскіх народаў.

У 1966 годзе выдавецтва «Вышэйшая школа» выпусціла вучэбны дапаможнік «Беларуская вусна-паэтычная творчасць» для студэнтаў філалагічных факультэтаў, над якім працавала група нашых аўтараў. Зараз мы працуем над стварэннем падручніка па старажытнай беларускай літаратуры.

Як і раней, прыцягвае мяне даследаванне традыцый рускага рэалізму ў беларускай літаратуры.

Пры кафедры працуюць два студэнцкія навуковыя гурткі — па беларускай савецкай літаратуры і па беларускаму фальклору. У прыватнасці, фальклорны гурток (кіраўнік — Н. С. Гілевіч) сабраў вялікі фактычны матэрыял і цяпер рыхтуе яго да друку. Кафедра ўдзяляе вялікую ўвагу творчай моладзі. Пры газеце «Беларускі універсітэт» паспяхова працуе літаратурнае аб'яднанне «Узлёт», якім кіруе дацэнт кафедры Алег Лойка. Гэтае аб'яднанне выдала ўжо дзве кнігі паэзіі; нядаўна выйшла з друку кніга «Натхненне» — вынік працы ўзлётаўцаў за апошнія два гады.

Якія нашы планы на будучае? Мы па-ранейшаму будзем працаваць над пытаннямі традыцый і наватарства, станаўлення метаду сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры, над выяўленнем шматбаковых і плённых сувязей паміж славянскімі літаратурамі. Не застанецца ў баку і сучасны літаратурны працэс, а таксама даследаванне нашай класічнай спадчыны. Безумоўна, выйдуць з друку новыя цікавыя кнігі, будуць створаны падручнікі па беларускай літаратуры для вышэйшай школы.

Кафедра беларускай літаратуры разам з іншымі кафедрамі факультэта імкнецца развіваць і ўмацоўваць міжнародныя навуковыя сувязі, перш за ўсё — з кафедрай беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, з кафедрай украінскай і беларускай літаратур Пражскага універсітэта і іншымі. Цікава адзначыць, што да нашай кафедры прыкамандзіраваны выкладчыкі Варшаўскага універсітэта Алесь Баршчэўскі і Мікола Врублеўскі. Першы з іх ужо абараніў дысертацыю пра творчасць Якуба Коласа. У сваю чаргу, аспірант І. Саламевіч дзесяць месяцаў працаваў у архівах Польшчы, збіраў матэрыял для кандыдацкай дысертацыі «Міхал Федароўскі — фальклярыст». У розны час і ў розных замежных навучальных установах чыталі лекцыі супрацоўнікі кафедры В. В. Казлова, А. А. Лойка, Н. С. Гілевіч, аўтар гэтых радкоў і іншыя.

Калектыў кафедры, ідучы насустрач слаўнаму юбілею рэспублікі, яшчэ з большай энергіяй будзе працаваць над паляпшэннем якасці вучэбна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў, а таксама над стварэннем новых навуковых прац, вартых ідэй Вялікага Кастрычніка.

**М. ЛАРЧАНКА,**
**прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры.**

# ЁН НАС ВУЧЫЎ

*Пра творчасць Я. Коласа нямала напісана артыкулаў, навуковых даследаванняў, успамінаў. Зусім мала сказана аб ім як педагогу, настаўніку, выкладчыку роднай мовы. Я нідзе не чытаў успамінаў аб працы Я. Коласа ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў якасці выкладчыка роднай мовы.*

*Гэта было ў 1926 годзе на этнолага-лінгвістычным аддзяленні педфака БДУ. Пачатак заняткаў у новым навучальным годзе. Студэнты ў аўдыторыі чакалі выкладчыка беларускай мовы Міцкевіча К. М. Не ўсе ведалі, што гэта будзе Я. Колас. Сустрэлі мы яго з вялікай радасцю. Перад намі быў выдатны майстар слова, вядомы беларускі пісьменнік.*

*Заняткі па роднай мове, методыка правядзення іх адразу захапілі нас, ён вёў іх так, што мы адчулі мастацкасць, прыгажосць і сілу роднага слова.*

*У нас з'явілася жаданне як мага хутчэй авалодаць вуснай і пісьмовай літаратурнай беларускай мовай. Мы вывучалі яе з вялікай ахвотай, кожны студэнт заўсёды старанна рыхтаваўся да такіх заняткаў. Часта студэнты звярталіся да Канстанціна Міхайлавіча з просьбай прачытаць свае новыя творы.*

*Наш любімы настаўнік задавальняў просьбу. Чытаў ён выразна, з натхненнем, гэта быў узор таго, як карыстацца мастацкім словам, даносіць яго да слухача.*

*М. ЖЫРКЕВІЧ,*
*заслужаны дзеяч навукі БССР.*



# СПРАВАЗДАЧА ДЭКАНА

20 сакавіка партыйны камітэт універсітэта заслухаў справаздачу дэкана падрыхтоўчага факультэта Міхаіла Кірылавіча Гарбачова аб вучэбна-выхаваўчай рабоце сярод замежных студэнтаў.

Першы семестр 1967-1968 навучальнага года студэнты факультэта закончылі з добрымі адзнакамі.

Дэканат, партыйнае бюро праводзяць вялікую работу па спалучэнню метадаў навучання і выхавання ў працэсе вучобы, па выхаванню замежных студэнтаў на ідэях марксізма-ленінізма, па азнаямленню іх з савецкай рэчаіснасцю.

Замежныя студэнты паказваюць добрую арганізаванасць і дысцыпліну, актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх палітычных мерапрыемствах факультэта і універсітэта.

Паралельна з гэтым на факультэце усё яшчэ слабая работа па падрыхтоўцы замежных студэнтаў да ўспрымання на слых лекцый, якія чытаюцца на рускай мове, не робіцца спробы абагульнення багатай практыкі вучэбнай работы на падрыхтоўчым факультэце.

Партыйны камітэт прыняў адпаведную рэзалюцыю, накіраваную на выкараненне недахопаў у вучэбна-выхаваўчай рабоце на факультэце.

*Выкладчыца падрыхтоўчага факультэта Тамара Аляксандраўна Малама дапамагае в'етнамскім студэнтам правільна рашыць задачу па хіміі.*

*Ля дошкі — Фам Канг Зыонг.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

# ГУЧЫЦЬ СЛОВА ЛЕКТАРА

На працягу многіх гадоў калектыў лектараў раённага аддзялення таварыства «Веды» БДУ выступае перад працоўнымі гарадоў і вёсак рэспублікі. Разнастайная і актуальная тэматыка, цудоўнае майстэрства і шырокая эрудыцыя заваявалі нашым лектарам зайздросную папулярнасць.

Каля двух тысяч лекцый у год—такі вынік працы калектыва, якім кіруе дацэнт фізічнага факультэта М. Я. Рэзнікаў.

Слова лектара гучыць не толькі ў студэнцкіх групах, але і ў цахах прамысловых прадпрыемстваў Мінскай вобласці, у школах, творчых арганізацыях. Сотні людзей слухалі старога камуніста, ветэрана рэвалюцыі І. А. Кажанкова, прафесараў М. Р. Ларчанку, Л. І. Фіглоўскую, дацэнтаў Б. П. Міцкевіча, З. С. Мелкіх, І. П. Кахно, Н. Н. Рамашка, С. А. Лысенка.

Пастаянна працуюць з моладдзю 25 лектараў секцыі ваенна-патрыятычнага выхавання. Да 50-годдзя Узброеных Сіл СССР яны правялі 50 гутарак са студэнтамі, выступілі ў школах і рабочых аўдыторыях.

Вялікая падрыхтоўчая работа праведзена ў сувязі з 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі, 150-годдзем з дня нараджэння К. Маркса і стагоддзем з дня нараджэння М. Горкага. Распрацаваны планы факультэцкіх лекторыяў. Студэнты усіх факультэтаў пачуюць лекцыі «Ленін і Горкі», аб творчасці вялікага пралетарскага пісьменніка.

Вялікую цікавасць выклікаюць цыклы «Па краінах свету», арганізаваныя ў Палацы культуры трактарнага завода, «Трыбуна вучонага» — на інструментальным заводзе ГПТУ № 77, горкаўскія чытанні. Уваходзіць у традыцыю гутарка за круглым сталом сярод аўтазаводцаў. Так, двойчы ўжо выязджаў на завод у поўным складзе калектыў кафедры асноў навуковага камунізма.

У дні святкавання горкаўскага юбілею да рабочых аўтазавода выедзе вялікая група філолагаў. Яны выступяць адначасова ў розных цэхах.

С. ДУБКО.



*Для студэнтаў IV курса гістарычнага факультэта надышла апошняя сесія. Цяпер яны паспяхова здаюць экзамены, залікі, каб у хуткім часе прыступіць да напісання дыпломных.*

*На здымку: студэнт IV курса гістфака Іван Чыгілеўскі здае экзамен па навейшай гісторыі краін захаду дацэнту Д. С. Клімоўскаму.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

# ШЧАСЛІВЫЯ НАШЧАДКІ

«Невялічкая вёска ў адну вуліцу выглядала непрыветла і няўтульна... патанала ў балоце», —пісаў Якуб Колас аб нашай вёсцы Люсіна.

У 1902 годзе, пасля заканчэння Нясвіжскай семінарыі, малады Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч прыехаў сюды настаўнічаць. Цёмнае, глухое было сяло. Школа стаяла пасярод вёскі, ля яе—крыж. Адзін настаўнік вучыў чатыры класы. Многія дзеці, асабліва дзяўчынкі, не маглі вучыцца. Потым Якуб Колас і напісаў аб вёсцы аповесць «У палескай глушы».

Новае жыццё прыйшло на Палессе. Усё змянілася тут з таго часу. Цяпер у Люсінскай сярэдняй школе вучыцца каля паўтысячы дзяцей. Летась у выпуску былі два першыя медалісты. Адзін з іх, Мікалай Рылка, паступіў у БДУ і вучыцца на першым курсе хімфака. Другога былога вучня школы, Іосіфа Занька, прывабіў геафак. Зараз ён ужо студэнт трэцяга курса. Яго сябар Рыгор Варвашэвіч вучыцца ў інстытуце замежных моў...

Павышаюць веды ў БДУ і самі настаўнікі школы. Летась П. Ф. Мелехавец завочна закончыў геафак і выкладае ў 9 і 10 класах. І. С. Занька вучыцца завочна на чацвёртым курсе гістфака. Многія вучацца ў Брэсцкім педінстытуце.

Позна свецяцца вокны ў сяле, не спяць настаўнікі. Яны рыхтуюцца да новага дня. Заўтра новыя клопаты.

М. БАБОК,
студэнт I курса
журфака.





Старанна вывучаюць геаграфію зямнога шара нашы географы. Яны заўсёды з картамі. Аня Марозава і Тамара Вярэніч затрымаліся каля глобуса, каб паўтарыць тое, што чыталася на лекцыі.

На здымку: (унізе) студэнты трэцяга курса фізфака А. Елісееў і Д. Карабань на практычных занятках.

Фота І. Аскіркі.

*ТАВАРЫШ ПРА ТАВАРЫША*

# САПРАЎДНАЕ СЯБРОЎСТВА

У пакой Лёва ўбег усхваляваны.

— Пісьмо! Глядзі! — яшчэ ў дзвярах закрычаў ён.

— Якое пісьмо, ад каго?

— Ну, ад Валодзькі, Локсава...

У час зімовых канікул, калі мы са сваім сябрам Львом Барташам ездзілі да яго дадому, на вакзале ў горадзе Масты нас сустрэў хлопец год васемнаццаці.

— Знаёмцеся, — сказаў тады нам Лёва.

— Уладзімір, — працягнуў хлопец мне руку.

І вось мы ў маленькім пакоі Уладзіміра. На стале самавар.

— Ведаеце, я вас пакіну, мне якраз на працу, — гаворыць Уладзімір, — гаспадарце пакуль.

— Там ад мяне пакланіся свайму станку.

Гэтыя словы Лёвы моцна ўкалолі яго сябра.

Валодзя падыйшоў і ціха сказаў:

— Ужо не працую там, у міжкалгасбудзе цяпер. Вось так. Усё раскажу потым, — і ён выбег з пакою.

Лёва дастаў цыгарэты, закурыў.

— Гэта брат? — запытаў я.

— Амаль...

— Як гэта?

— Ну, ты ж ужо ведаеш аб маім жыцці. Аб Локсаве, здаецца, я табе таксама расказваў.

Лёва стаў каля акна, з якога відаць была шырокая стужка Нёмана.

Ужо пасля вайны бандыты забілі бацьку Лёвы. Хлапец выхоўваўся ў дзіцячым доме. Там ён скончыў восем класаў. Затым пайшоў вучнем токара на мастоўскі дрэваапрацоўчы камбінат. Але вучобы не кідаў. Вучыўся ў вячэрняй школе.

У невялічкім пакоі, які ў хуткім часе далі яму, можна было бачыць выбраныя творы Пушкіна, Лермантава, Ясеніна, беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Сам спрабаваў пісаць вершы. І часамі атрымліваліся неблагія рэчы. Некаторыя з іх друкаваліся ў рэспубліканскай прэсе. Усё гэта зарадзіла ў ім мэту паступіць на філалагічны факультэт БДУ.

У хуткім часе Леў Барташ авалодаў прафесіяй токара. Яму быў прысвоены III разрад, асобна за ім быў замацаваны станок. Хлопец добра спраўляўся са зменнымі нормамі. І таму ніхто не здзівіўся, калі над станком Барташа стаў узвівацца чырвоны сцяжок «Лепшаму рабочаму цэха».

А неўзабаве Лёва прыняў першага вучня — Валодзю Локсава. Хлопец таксама з дзіцячага дома. Хутка яны моцна пасябравалі, нават жыць сталі ў адным пакоі...

Радасці абодвум не было канца, калі Лёву прыйшло паведамленне аб заліку яго студэнтам філфака БДУ. К гэтаму часу Валодзю Локсаву таксама быў прысвоены III разрад. Урачыста перадаў Лёва сябру свой станок і ключы ад пакоя.

— Але ты прыязджай, — гаварыў на развітанне Валодзя, — мы ж амаль што браты.

У першыя зімовыя канікулы Лёва адпачываў у сваіх сяброў па вучобе. Летам працаваў на цаліннай будоўлі. І вось толькі праз паўтара года ён зноў сустрэўся са сваім былым сябрам.

...Лёва адышоў ад акна, затушыў цыгарэту.

— Давай махнём на завод, — прапанаваў ён.

Сустрэлі нас прыветліва і мы даведаліся аб лёсе ўжо нашага агульнага таварыша. У хуткім часе пасля ад'езду Лёвы Валодзя пасябраваў з нядобрай кампаніяй. Стаў піць. Здараліся выпадкі, што п'яным прыходзіў на працу або нават зусім не хадзіў. Некалькі разоў ён атрымліваў вымовы. Гаварылі аб ім і на прафсаюзных, камсамольскіх сходах, але нічога не дапамагала. Прышлося зволіць.

Дома ў нас адбылася сур'ёзная размова з Валодзем.

— Усё ж патрэбна дапамагчы хлопцу,—сказаў Лёва, калі мы засталіся ўдваіх.

Мы неаднаразова гутарылі з начальнікам цэха, дырэктарам камбіната. Былі разам з Валодзем у прафкоме. Сустракаліся з сакратаром камсамольскай арганізацыі.

— Ведаеце, у бліжэйшыя дні будзе камсамольскі сход. На парадку дня ёсць і пытанне аб Уладзіміре Локсаве. Мабыць, возьмем на парукі. Але пры ўмове, што ён выправіцца.

У хуткім часе мы ад'ехалі ў Мінск. Перад гэтым Барташ сказаў Локсаву.

— Пішы. Адрас ты ведаеш. І не рабі больш глупства. У школу нядрэнна будзе пайсці зараз, у дзявяты клас. Хоць і паўторна.

...І вось Лёва падае мне пісьмо. Я ўсхвалявана чытаю радкі. Вось што нам піша Валодзя Локсаў:

«Мне паверылі, і я зараз працую токарам па трэцяму разраду, нават на сваім станку. У школу таксама пачаў хадзіць. Ужо трэці дзень на занятках. Ведаеце, як добра жыць».

І ў канцы:

«Вы таксама не рабіце глупства. Больш працуйце. Навука таксама лёгка не даецца».

— Бачыш, усё добра, — гавару я.

— Так і павінна быць, — усміхаецца Барташ.

С. БАЛОТКІН,
студэнт філфака.

# З асабістага пункту гледжання

Мабыць, размова аб ім будзе павярхоўнай, можа, што-небудзь у ёй я перабольшыў, а чагосьці недагледзеў, аднак ён, Юрый Казіцкі, адштурхоўваючы мяне сваімі адносінамі да некаторых цікавячых нас абодвух пытанняў, выклікаў адначасова ў мяне павагу, а затым і сімпатыю да асаблівасцей яго характару.

Сярод іншых аднакурснікаў ён выдзяляўся, перш за ўсё, як чалавек, каторы мае сваю даволі цвёрдую перакананасць. Гэта была перакананасць цвярозага рэаліста, які не жадае дарэмна траціць сябе на мары і туманныя імкненні. Ён слухаў толькі голас розуму, падпарадкоўваючы сваю волю дасягненню мэты.

— Журналістыка не церпіць рамантызму, — даказваў ён, непахісна ўпэўнены ў сваёй праваце.—Газета— не «вялікая» літаратура. Газетчыкі не выдзяляюцца талентамі сусветнага значэння. «Мураўіная» праца, якая забірае ўсе іх сілы, не пакідае часу для вялікай творчасці. А ты хочаш адразу гэтага. Вядома, я таксама аб гэтым мару, як і кожны журналіст. А ці ёсць у цябе аб чым расказаць людзям? А ці змагу я сказаць ім? Ці пажадаюць яны слухаць мяне? Не. Пабудзь ты спачатку чарнарабочым у газеце, пастаянна выконвай тое, чаго ад цябе патрабуюць, патрымай свае думкі на адной паласе з усімі, хто стаіць вышэй за цябе; працуй клапатліва і няспынна, прабівайся наверх, — і ўжо там, на больш шырокім прасторы, які нейкім чынам дае высокая пасада ў газеце, там, навучаны жыццёвым вопытам, зацвярджай свае ісціны. Тады ты зможаш не толькі выслухоўваць загады і падпарадкоўвацца ім, але і загадваць сам!

Гэта, як мне здалося, галоўнае ў ім — імкненне да ўлады — з'яўлялася не самамэтай, не жаданнем спачываць на лаўрах матэрыяльнага дабрабыту. Не было гэта і жаданнем аддаваць загады, каб самаўпэўнена задавальняцца іх выкананнем. Не, у гэтым было нешта іншае: не толькі даказаць, але і зацвердзіць у жыццё свае ідэі...

У Юры, вядома, мяне прыцягвалі не столькі словы, наколькі адданасць ім у жыцці.

Ён малады, здаецца, 23 ці 24 гады, але за яго спіной ужо многа пражытага. У арміі — праца ў газеце, пасля дэмабілізацыі — у райкоме камсамола, уступленне ў рады КПСС. Адсюль, ён пакідае родны горад, таму што там практычна не было магчымасцей уладкавацца ў газеце. А з'яўляецца такая магчымасць у невялікім беларускім гарадку Клецку. З гэтай мэтай за некалькі месяцаў ён авалодвае беларускай мовай...

Заўважыў я ў ім тое, што праяўляецца ўжо ў вопытных журналістаў: адчуванне рамантычнай, але даволі цяжкай прафесіі журналіста.

— Жаўтаротыя птушаняты пішчаць аб сваёй любві да журналістыкі, не ведаючы нават што гэта такое — газета. А папрацаваўшы ў раёнцы, ды яшчэ пры недахопе людзей, яны хутчэй праклялі б яе і, не вытрымаўшы, уцяклі. Трэба днём збіраць матэрыял, а па начах апрацоўваць яго, хавацца ў пакойчыку паспадыні і сілкавацца ў сталовай — і ўсё ж любіць сваю цяжкую работу...

Юра змоўк. І я падумаў, што цяпер ён дабавіць: «Любіць яе так, як люблю яе я!» Але гэтага не адбылося, хоць ганаровае пачуццё ўласнага «я» звінела ў кожнай ноце яго голаса.

Я не згодны быў з некаторымі яго думкамі, а путаўся ў асабістых. Ён жа здзіўляў мяне халоднай яснасцю сваіх палажэнняў, самаўпэўнена выкладваючы іх, ён быў, несумленна, упэўнены ў асабістай праваце...

Такім было маё ўражанне аб Юры Казіцкім. Упершыню я сустрэў чалавека, з якім у мяне не было нічога агульнага, але які разам з тым выклікаў да сябе павагу.

М. ЯЛОН.

# 1968

*УСПОМНІМ, ТАВАРЫШ...*



*У начным дазоры. Фотаэцюд А. НІКАЛАЕВА.*

# Жывыя ў памяці

Я быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны з 27 чэрвеня 1941 па люты 1945 года.

Упершыню мне прышлося ўступіць у бой дзевятнаццацігадовым юнаком 3 ліпеня 1941 года пад мястэчкам Багуслаў Кіеўскай вобласці. Немцы, сканцэнтраваўшы баявыя сілы ў раёне Белая Царква, імкнуліся прыціснуць нашы часці да Дняпра, фарсіраваць яго паміж Каневам і Чаркасамі і завяршыць акружэнне Кіева з поўдня. Стрымліваючы наступленне немцаў, наша стралковая дывізія вяла цяжкія баі. Асабліва мне запамятаўся бой з нямецкімі танкамі 4—5 ліпеня ў сяле Яхна. Наш узвод 45-мм супроцьтанкавых гармат адбіваў наступленне 12 танкаў. У гэтым баі два танкі былі спалены, адзін падбіты, астатнія, не вытрымаўшы агню нашых гармат, адступілі, пакінуўшы вёску Яхна. У гэтым баі мы ўпэўніліся ў сіле нашай зброі.

Прыпамінаецца і такі эпізод. У жніўні 1941 года наша дывізія была перадыслацыравана ў раён горада Канатопа. У вёсцы Церны мы дзён 10—12 вялі ўпартыя баі. Немцы некалькі разоў пасылалі да нас сувязных, паведамлялі, што мы акружаны, і прапаноўвалі здацца ў палон. Але на гэтыя прапановы мы адказвалі агнём з усіх гармат. Так у баях загартоўваліся савецкія воіны, набывалі вопыт вядзення баёў у разнастайных умовах. Праз два гады, у жніўні 1943 года, гэты вопыт спатрэбіўся, калі на безымянай вышыні каля горада Багадухава адбыўся жорсткі бой нашых самаходных артылерыйскіх батарэй з танкамі праціўніка. У гэтым баі было прарвана варожае кола і выведзен з акружэння наш танкавы корпус.

Памяць захавала мноства баявых эпізодаў, у якіх яскрава адлюстраваліся гераізм, мужнасць і майстэрства савецкіх воінаў.

*А. ПЕРАВОЗЧЫКАЎ.*

# НА ОДЭРСКІМ ПЛАЦДАРМЕ

**Пачатак лютага 1945 года. Невялікія замаразкі ноччу, адліга — днём.**

**Наша часць пасля прарыву варожай абароны на поўдзень ад Варшавы, праследуючы гітлераўцаў, выйшла на ўсходні бераг ракі Одэр каля Франкфурта. Ноччу, у ледаход, на паромах і плытах пераправіліся на заходні бераг Одэра, змяніўшы дзейнічаючую часць.**

**У ліку першых, нарыстаючыся цемнатой, ступіў на бераг узвод 45-міліметровых пушак і заняў там выгадныя пазіцыі.**

**Вораг адчуў, што на плацдарм каля двух кіламетраў па фронту і 400—600 у глыбіню падыйшлі новыя часці. Як толькі пачало світаць, немцы арганізавалі моцную атаку. Бой цягнуўся больш трох гадзін. Гітлераўцы чатыры разы спрабавалі збіць нас з «пятачка» на заходнім беразе Одэра, але кожны раз адкочваліся назад.**

**Узвод у першы дзень знішчыў пяць агнявых пунктаў і больш 30 гітлераўцаў.**

**Па дзве-тры контратакі немцаў адкідвалі воіны часці на працягу ўсяго тыдня. Пазіцыі гармат прыходзілася мяняць за суткі тры-чатыры разы. Няпоўныя разлікі гармат дзейнічалі дакладна і ўпэўнена. Раненыя не пакідалі пазіцый, а пасля першай медыцынскай дапамогі зноў знаходзіліся разам са сваімі баявымі сябрамі.**

**У канцы лютага мне зноў прышлося перапраўляць з усходняга берага праз Одэр узвод 76-мм палкавых пушак.**

**У канцы сакавіка часць вяла баі па пашырэнню плацдарма, а 16 красавіка, з пачаткам Берлінскай аперацыі, на другі дзень наступлення часць авалодала Франкфуртам.**

**За паспяховыя дзеянні на одэрскім плацдарме і авалоданне горадам Франкфуртам увесь асабісты састаў узвода быў узнагароджан ардэнамі і медалямі, я атрымаў у тыя незабыўныя дні наступлення ордэн Айчыннай вайны II ступені.**

**М. СУБОЦІН,**
**выкладчык.**

# «ХРЫСТОСІК» ІДЗЕ Ў АТАКУ

Гэтую незвычайную гісторыю дасканала даследаваў і расказаў пісьменнік С. Смірноў. Для нас яна яшчэ цікава тым, што адбылася пры вызваленні Савецкай Арміяй Беларусі.

Перад летнім наступленнем войск Першага Беларускага фронта ў 1944 годзе група разведчыкаў у складзе 22 чалавек была накіравана ў тыл ворага, каб узарваць чыгуначную лінію, на якой гітлераўцы атрымлівалі вялікую дапамогу. Разам з групай па асабістаму заданню камандавання фронта пайшоў яшчэ адзін чалавек. Гэта быў хлапчук 12—14 гадоў. Па няпісанаму закону ў такіх выпадках разведчыкі аб сваім спадарожніку нічога не ведаюць. Да таго ж, трымаўся ён надзвычай незалежна.

Калі перайшлі лінію фронта, хлапчук прапаў. Сустрэўся ён з групай тады, калі яна ўжо выбрала аб'ект дыверсіі—ціхі раз'езд. Тут якраз спыніўся поезд са снарадамі. Падпоўзшы да камандзіра разведчыкаў, якія назіралі за ворагам з кустарніку, малыш папрасіў у яго ўзрыўчатку, прычым тонам, які не дапускаў супярэчнасцей.

— Што ты задумаў, — спыталі ў яго.

А хлапчук ужо падбіраўся да эшалона. І тут яму пашанцавала. Збоку фронта на раз'езд прыйшоў сустрэчны поезд з раненымі. Ахова кінулася да іх і ў гэты момант якімсці цудам хлапчук прымацаваўся з цяжкім грузам пад вагонам са снарадамі.

Цягнік рушыў. Наперадзе — пад моцнай аховай немцаў мост. Прайшло некалькі хвілін і страшэннай сілы выбух страсянуў наваколле. Пачалася паніка і на раз'ездзе. Разведчыкі адыйшлі і злучыліся з другой групай, якая была ў засадзе каля рэчкі. Тыя і расказалі што хлапчук перад узрывам маста з поезда скочыў у рэчку і паплыў. Але яго злавілі немцы.

Было вырашана вызваліць безымянага юнапа героя. Калі разведчыкі разграмілі ахову, у «каравулцы» ўбачылі жудасную карціну. Хлапчук быў прыбіты цвікамі да сцяны, пальцы рук расплюшчаны нечым цяжкім. Ён быў у непрытомнасці.

Перастрэлка прыцягнула ўвагу немцаў, што былі на раз'ездзе. Яны пачалі праследаваць савецкіх байцоў. Потым засада. Адступілі да другой рэчкі. На беразе аказалася лодка без вёслаў. Камандзір загадаў двум разведчыкам палажыць хлапчука і плыць па цячэнню, астатнія байцы пачалі прыкрываць іх.

Надзеі на выратаванне жыцця хлапчука засталося мала, ён быў зусім слабы, абескрываўлены.

...Праз некалькі тыдняў той самы камандзір батальёна разведкі прыехаў у вызвалены Мінск, у штаб фронта. Ля будынка размясціўся ваенторгаўскі фургон-фатаграфія. На вітрыне аказаўся здымак таго самага хлапчука. Але фатограф не мог назваць ні яго імя, ні прозвішча. Сказаў, што чуў — дзесьці загінуў.

А хлапчук застаўся жыць. Ужо каля граніцы, пасля шпіталя, ён дагнаў свой полк, а хутка пад Варшавай змог сказаць: «Хрыстосік — у атаку» (Хрыстосікам назваў яго адзін з уцалелых разведчыкаў, які выратаваў хлапчука). Пад Берлінам яго яшчэ раз цяжка параніла і кантузіла. Калі скончылася вайна, яму яшчэ не было і чатырнаццаці год. На грудзях у хлапчука зззялі ордэны Айчыннай вайны, Славы 3-й ступені, пяць медалей.

Ужо многа пазней ён перанёс цяжкую хваробу— сталі пухнуць пальцы рук. І зноў выйшаў пераможцам. Вось толькі памяць падводзіць — многае не можа ўспомніць. Аб сваім подзвігу ён не расказваў падрабязна нават у сваёй часці вярнуўшыся са шпіталю, ды і многае не памятаў. Мо таму гэта, як і яго імя, стала вядома шырокаму чытачу больш, чым праз дваццаць год, дзякуючы пошукам былых разведчыкаў і намаганням пісьменніка.

Вось ён: Аляксандр Аляксандравіч Калеснікаў, інжынер-мантажнік Маскоўскага трэста «Энергавугаль», герой просты і сціплы, як усе сапраўдныя героі. На беларускай зямлі ён здзейсніў свой выдатны подзвіг, прыняў ад фашыстаў страшныя мучэнні, беларускі лес схаваў яго, хутар беларускага калгасніка стаў на некалькі дзён яго роднай хатай.

**І. МІХАЙЛАЎ.**

# КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў ШКОЛЕ

На гэтай канферэнцыі былі і дакладчыкі, і госці, працавалі секцыі, але праправодзілася яна не ў навуковым цэнтры, а ў мінскай школе № 50.

Сярод гасцей былі доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Ю. С. Багданаў, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар В. Ф. Платонаў, старэйшы навуковы супрацоўнік інстытута матэматыкі АН БССР, доктар фізіка-матэматычных навук В. Г. Спрынджук.

— Кожная матэматычная канферэнцыя — свята для нас. З гонарам за будучае пакаленне прыйшлі мы сюды, — сказаў у сваім звароце да ўдзельнікаў канферэнцыі прафесар Ю. С. Багданаў.

З вялікай увагай слухалі ўдзельнікі выступленні В. Г. Спрынджука і В. Ф. Платонава, якія расказалі аб асноўных напрамках у сучаснай матэматыцы.

Канферэнцыю падрыхтавалі разам з выкладчыкамі студэнты матэматычнага факультэта нашага універсітэта В. Шэмчук, Б. Камракоў, Б. Тройчанская, М. Чанкіна. Вялікую работу па падрыхтоўцы і правядзенню канферэнцыі зрабіў студэнт трэцяга курса В. Шэмчук, які вось ужо на працягу двух гадоў кіруе ў гэтай школе матэматычным гуртком.

Такія канферэнцыі даюць магчымасць выяўляць здольных вучняў, якія цікавяцца матэматыкай і, дапамагчы ім у выбары прафесіі.

**АБ'ЯВА**

**27 сакавіка, у сераду, а 7 гадзіне вечара ў кабінеце беларускай літаратуры адбудзецца чарговае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт».**

# ГОРКАЎСКІЯ ДНІ

**Учора на філалагічным факультэце пачалася навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння вялікага пралетарскага пісьменніка М. Горкага.**

**Былі праслуханы даклады прафесараў Ф. І. Кулюшова «М. Горкі і некаторыя пытанні рэалізма», М. Р. Ларчанкі «М. Горкі і культура беларускага народа», дацэнтаў І. П. Кахно «А. В. Луначарскі і М. Горкі», Б. П. Міцкевіча «М. Горкі аб заходнееўрапейскім рэалізме», Н. В. Галаўко «М. Горкі аб пісьменніках-дэмакратах», З. С. Мелкіх «М. Горкі і Чэхаў».**

**Канферэнцыя працягне сваю работу 22 і 23 сакавіка (пачатак а другой гадзіне дня, аўдыторыя № 37). У гэтыя дні мяркуецца праслухаць наступныя даклады: прафесараў М. Г. Булахава і А. Е. Супруна—«Лінгвістычны аналіз лексікі «Песні пра Буравесніка» і яе беларускага перакладу», Л. І. Фіглоўскай — «М. Горкі і Я. Колас», дацэнтаў І. Я. Навуменкі—«М. Горкі і Я. Купала», Н. І. Лапідуса — «М. Горкі і М. Багдановіч», В. А. Захаравай — «Філасофская спрэчка аб чалавеку ў драматургіі М. Горкага і С. Алёшына», М. Б. Яфімавай — «М. Горкі і беларуская дзіцячая літаратура», В. М. Цімафеевай — «М. Горкі і балгарская літаратура», І. Л. Парашковай — «Маці Горкага і «Маці» К. Чапека», І. Ц. Ішчанкі — «Пародыя ў ранняй творчасці М. Горкага», С. А. Лысенка — «М. Горкі і праблемы развіцця ўкраінскай драматургіі», кандыдата філалагічных навук П. І. Ткачова — «М. Горкі аб шляхах развіцця савецкага памфлета», аспіранта П. І. Жураўскага—«М. Горкі і Ф. Панфёраў».**

# КРАСВОРД



**КРАСВОРД, які складзен групай студэнтаў-радыёфізікаў, патрабуе не столькі глыбокай эрудыцыі, колькі развітага пачуцця гумару.**

**ПО ВЕРТИКАЛИ: 1. Импульс силы, сообщаемый телу. 2. Крупнейшее транспортное изобретение эпохи неолита. 3. Безалкогольный напиток. 4. Многоглазый сторож в Древней Греции. 5. Альма-матер. 6. Прибор для наблюдения и записи электрических колебаний. 7. Знойный, как дыхание летней сессии, ветер пустыни. 8. Улыбка студента-отличника. 9. Орудие эскулапа стоматолога. 10. Бабушкина мебель. 11. Одна из комбинаций при игре в покер. 12. Злое зелье. 13. Древний прогнозист. 14. Оппозиционер средних веков. 15. Громоздкий музыкальный инструмент средних веков и наших дней.**

**ПО ГОРИЗОНТАЛИ: 1. Человек, придерживающийся отживших идей и взглядов. 2. Часть вечера отдыха, предшествующая танцам. 3. Однокомнатная коммунальная квартира в русских народных сказках. 4. Прибор для определения чего-нибудь. 5. Механизм для выигрыша в силе или скорости. 6. Любимое лакомство Ходжи Насреддина. 7. Студенческая организация, деятельность которой скрыта мраком неизвестности от самих студентов (во всяком случае у нас, на физфаке). 8. Поэма Вознесенского. 9. Джентльмен удачи. 10. Сквозное отверстие. 11 Древний анекдот. 12. Любимый напиток джентльмена удачи. 13. Мелкое домашнее животное, умеющее бегать по потолку. 14. Древнегреческое празднество в честь Вакха. 15. Основное орудие труда преподавателя квантовой механики. 16. Брат Тома Сойера. 17. Щит Зевса. 18. Окно в мир. 19. Прибор, предназначенный для поддержания постоянной температуры. 20. Официальный покой начальника. 21. Крик о помощи. 22. Искусительница Одиссея.**

**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

АТ 00135 Зак. № 504. **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**